**ПЕРШЫ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**2022/2023 навучальны год**

**9 клас**

**Комплексная работа**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Адзначце правільныя сцверджанні:**

*Колькасць балаў – 6*

1. Граматычная аснова сказа можа складацца з аднаго члена сказа – дзейніка або выказніка.
2. Калі дзейнік і выказнік выражаны назоўнікамі ў назоўным склоне, паміж імі заўсёды ставіцца працяжнік.
3. У слове 'дождж' чатыры гукі.
4. Дзеепрыслоўе – асобая нязменная форма дзеяслова.
5. Акцэнталагічныя нормы рэгулююць месца размяшчэння націску ў словах.
6. Асноўныя адзінкі сінтаксісу – слова, словазлучэнне, сказ і тэкст.
7. Пры змяненні слова (напрыклад, скланенні назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў) утвараюцца формы аднаго і таго слова.
8. Словы ў словазлучэннях звязаны двума відамі падпарадкавальнай сувязі: дапасаваннем і прымыканнем.
9. Паводле паходжання прыназоўнікі падзяляюцца на вытворныя і невытворныя.
10. Паводле мэты выказвання сказы бываюць апавядальныя, пытальныя і клічныя.

**Заданне 2. Устаўце прапушчаныя літары:**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Т..рапія | Тэар..тычны |
| Хр..зантэма | Хр..сціць |
| Хар..аграфія | Бр..зент |
| Хр..стаматыя | Поч..рк |
| Акард..он | Эн..ргія |
| Др..васек | Кр..дыт |

**Заданне 3. Выпішыце словы, для якіх няправільна ўказаны словы, ад якіх яны ўтвораны. Запішыце правільны варыянт, вызначце спосаб словаўтварэння:**

*Колькасць балаў – 6*

Поўня ← поўны.
Ганьба ←ганьбаваць.
Сінеча ← сінь.
Прытуліць ← прытулак.
Храбрэц ← храбры.
Прыход ← ход.

**АДКАЗ:**_________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

**Заданне 4. З прыведзеных ніжэй слоў узнавіце і запішыце ў табліцу фразеалагізмы. Суаднясіце змест дзвюх частак табліцы.**

*Колькасць балаў – 6*

А. Не, камар, падточыць, носа.
Б. Малако, губах, абсохла, не.
В. Белы, у свет, капейку, як, у.
Г. Пазычыць, сабакі, у, вочы.
Д. Лапках, хадзіць, задніх, на.
Е. Не, спячэцца, языку, на, жаба.

| | |
|---|---|
| А. | 1. Нахабна, бессаромна. |
| Б. | 2. Прыслугоўваць, дагаджаць. |
| В. | 3. Пра маладога і неспрактыкаванага, недасведчанага чалавека. |
| Г. | 4. Хто-небудзь вельмі балбатлівы, не ўмее трымаць сакрэты. |
| Д. | 5. Не падкапаешся, не прыдзярэшся, не знойдзеш няправільнасці. |
| Е. | 6. (Страляць) не мецячыся. |

**Адказ:**

**Заданне 5. Ад прыведзеных назоўнікаў з дапамогай суфікса –ск- утварыце прыметнікі і запішыце згодна з правіламі арфаграфіі:**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Крывіч – | Рамеснік – |
| Сілезія – | Ірак – |
| Баранавічы – | Грамадства – |

**Заданне 6. Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы, запішыце.**

*Колькасць балаў – 6*

1. **Ужо** ў дзвярах ён азірнуўся.
2. **Паблізу** тоўпіліся людзі.
3**. Пасля** дажджу добра растуць грыбы.
4. Я хацеў **бы** спаткацца з Вамі.
5. Яму хацелася сустрэцца з Вікторыяй **яшчэ.**
6. На парце ляжалі **падпісаныя** сшыткі.

**Адказ**:1)_______________
2)______________
3) ______________
4)_______________
5)______________

6)_______________

**Заданне 7. Запішыце дзеясловы ў форме 2-й асобы множнага ліку.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Браць – | Пісаць – |
| Спяваць – | Берагчы – |
| Саліць – | Пячы – |

**Заданне 8. Вызначце ў кожным радзе памылковую склонавую форму назоўніка і запішыце правільную форму.**

*Колькасць балаў – 6*

1) Давяраць старасце, сіраце, Міколе;
2) сумаваць па бацьку, па нябозе, па Віці;
3) пайсці з заікай, са служакам, са слугой;
4) ганарыцца цеслем, дарадцам, Алёшай;
5) Дзіма з Колем, з Санькай, з Гошам;
6) ісці па вуліцэ, па дарозе, па снезе.

**Адказ:** 1) _________________
2) __________________
3)_____ _____________
4)___________________
5)___________________
6)___________________

**Заданне 9. Прачытайце. Вызначце назву і аўтара твора.**

*Колькасць балаў – 6*

1. Над пустым бульбянішчам Тэклінага агарода, над недалёкім выганам і дарогай, што, узбегшы на ўзгорак, хаваецца ў шэрай далечы, марудна паўзе восеньскі адвячорак. Некуды спяшаюцца імклівыя пакудлачаныя хмары ў небе, за хатамі ў вёсцы трывожна бляе авечка, і недзе разважна гергечуць гусі.

Тэкля сячэ, адпачывае ў кароткіх перапынках і ўвесь час азірае дарогу.

**Аўтар____________________, назва твора____________________**

2. Рака шалела. Нізавыя парывы вятрыскі раскалыхалі вялікія, у рост чалавека, хвалі. Яны каціліся супраць плыні, шоргаючы белымі грабянцамі. Хвалі ішлі адна за адной, і процілеглы бераг губляўся ў чарнільнай навальнічнай цемры.

Але і адтуль, са змроку, далятаў усхваляваны, нізкі гук вады.

**Аўтар____________________, назва твора____________________**

3. За вокнамі – позняя мокрая восень.

Чацвёрты і пяты класы злучаны ў адзін пакой – на “беларускую гадзіну”. Вучні-палякі пайшлі на гэты час дахаты, аднак і без іх у вялікім пакоі двум класам вельмі цесна.

**Аўтар____________________, назва твора____________________**

**Заданне 10. Выпішыце назвы радкоў *(напрыклад, А, Ж, К),* якія адлюстроўваюць ход развіцця беларускай літаратуры і дзе ўсе тры слупкі па сэнсе адпавядаюць адно аднаму. Вазьміце пад увагу, што ў табліцы прыведзены імёны пісьменнікаў, псеўданімы, назвы твораў, імёны персанажаў, гісторыка-літаратурныя факты і інш.**

*Колькасць балаў —6*

| | | | |
|---|---|---|---|
| А | Народная казка | «Разумная дачка» | Выяўленне народнай кемлівасці, дасціпнасці, розуму ў вобразе дачкі бедняка. |
| Б | Максім Багдановіч | «Вянок», 1913 | Паэтычнае апісанне вадзяніка як аднаго з персанажаў традыцыйнай беларускай міфалогіі. |
| В | Якуб Колас | «Паскудства, брат, і не пытайся!» | Дзядзька Антось |
| Г | Янка Брыль | «Паскудства, брат, і не пытайся!» | Пані Мар’я |
| Д | Янка Купала | 1882 | «Новая зямля» |
| Е | Самуіл Плаўнік | Пісьменнік паказае майстэрства ў раскрыцці думак і перажыванняў Тэклі, якая наведвае сына. | Змітрок Бядуля |
| Ж | Алесь Бачыла | «Радзіма мая дарагая» | Уладзімір Алоўнікаў |
| З | Мікалай Карлавіч Раманоўскі | Бацькі і дзеці: праблемы гуманнасці, высакароднасці, сумленнасці. | Аўтар дае характарыстыку Сержу праз канкрэтныя выразныя дэталі. |
| І | Іван Пташнікаў | «Алені» | Гісторыя Багіры і яе кацянятак. |
| К | Максім Багдановіч | «Вянок», 1910 | Паэтычнае апісанне вадзяніка як аднаго з персанажаў традыцыйнай беларускай міфалогіі. |
| Л | Уладзімір Караткевіч | Цыкл мастацкіх нарысаў «Зямля пад белымі крыламі» | Драматургія |

**Адказ:_________**

**Комплексная работа**
**9 клас**

## ДАВЕДКІ

**Заданне 1**. 1, 3, 4, 5, 7, 9

**Заданне 2. Устаўце прапушчаныя літары:**

| | |
|---|---|
| Тэрапія | Тэарэтычны |
| Хрызантэма | Хрысціць |
| Харэаграфія | Брызент |

| | |
|---|---|
| Хрэстаматыя | Почырк |
| Акардэон | Энергія |
| Дрывасек | Крэдыт |

**Заданне 3.**

Ганьба ←ганіць, суфіксальны спосаб.

Сінеча ← сіні, суфіксальны спосаб.

Прыход ← прыходзіць, бяссуфіксны (нульсуфіксальны) спосаб

**Заданне 4. З прыведзеных ніжэй слоў узнавіце і запішыце ў табліцу фразеалагізмы. Суаднясіце змест дзвюх частак табліцы.**

| | |
|---|---|
| А. Камар носа не падточыць | 1. Нахабна, бессаромна. |
| Б. Малако на губах не абсохла | 2. Прыслугоўваць, дагаджаць. |
| В. У белы свет як у капейку | 3. Пра маладога і неспрактыкаванага, недасведчанага чалавека. |
| Г. У сабакі вочы пазычыць | 4. Хто-небудзь вельмі балбатлівы, не ўмее трымаць сакрэты. |
| Д. Хадзіць на задніх лапках | 5. Не падкапаешся, не прыдзярэшся, не знойдзеш няправільнасці. |
| Е. Жаба на языку не спячэцца | 6. (Страляць) не мецячыся. |

Адказ: А 5, Б 3, В 6, Г 1, Д 2, Е 4

**Заданне 5. Ад прыведзеных назоўнікаў з дапамогай суфікса –ск- утварыце прыметнікі і запішыце згодна з правіламі арфаграфіі:**

| | |
|---|---|
| Крывіч – крывіцкі | Рамеснік – рамесніцкі |
| Сілезія – сілезскі | Ірак – іракскі |
| Баранавічы – баранавіцкі | Грамадства – грамадскі |

**Заданне 6.** 1. Часціца. 2. Прыслоўе. 3. Прыназоўнік. 4. Часціца. 5. Прыслоўе. 6. Дзеепрыметнік

**Заданне 7. Запішыце дзеясловы ў форме 2-й асобы множнага ліку.**

| | |
|---|---|
| Браць – берацe | Пісаць – пішаце |
| Спяваць – спяваеце | Берагчы – беражаце |
| Саліць – соліце | Пячы – печаце |

**Заданне 8. Вызначце ў кожным радзе памылковую склонавую форму назоўніка і запішыце правільную форму.**

1. Старасту. 2. Па Віцю. 3. З заікам. 4. Алёшам. 5. З Санькам. 6. Па вуліцы.

**Заданне 9. Прачытайце. Вызначце назву і аўтара твора.**

1. Васіль Быкаў. “Незагойная рана”
2. Уладзімір Караткевіч. “Паром на бурнай рацэ” (“Нельга забыць”)
3. Янка Брыль. “Урокі пані Мар’і” (“Сірочы хлеб”)

**Заданне 10.** А, Б, В, Е, Ж, З